УДК 069(476)

# МУЗЕІ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ г. ВІЦЕБСКА Ў 1920–1930-я гг.

***Д. І. Прыгодзіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, daryapryhodzich@gmail.com*

У артыкуле разглядаецца гісторыя фарміравання музеяў вышэйшых навучальных установаў г. Віцебска ў 20–30-я гг. ХХ ст. Прыведзены навучальныя музеі Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута, Вышэйшага педагагічнага інстытута, Ветэрынарнага інстытута, Медыцынскага інстытута. Характарызуецца дзейнасць музеяў па збору, вывучэнню, захаванню і выкарыстанню музейных калекцый у вучэбна-адукацыйным і навукова-даследчым працэсе.

***Ключавыя словы**: музей; кабінет; лабараторыя; вышэйшая навучальная ўстанова; калекцыя; музейны прадмет.*

# МУЗЕИ ВЫСШИХ УЧЕБНЫХ ЗАВЕДЕНИЙ г. ВИТЕБСКА В 1920–1930-е гг.

***Д. И. Пригодич***

*Белорусский государственный университет, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, daryapryhodzich@gmail.com*

В статье рассматривается история формирования музеев высших учебных заведений г. Витебска в 20–30-е гг. ХХ в. Приведены учебные музеи Витебского отделения Московского археологического института, Высшего педагогического института, Ветеринарного института, Медицинского института. Характеризуется деятельность музеев по сбору, изучению, сохранению и использованию музейных коллекций в учебно-образовательном и научно-исследовательском процессе.

***Ключевые слова**: музей, кабинет, лаборатория, высшее учебное заведение, коллекция, музейный предмет.*

# MUSEUMS OF THE HIGHER EDUCATIONAL INSTITUTIONS OF VITEBSK IN THE 1920–1930s.

***D. I. Pryhodzich***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, daryapryhodzich@gmail.com*

The article discusses the history of the formation of museums of higher educational institutions of the city of Vitebsk in the 20–30s. XX century Educational museums of the Vitebsk branch of the Moscow Archaeological Institute, the Higher Pedagogical Institute, the Veterinary Institute, and the Medical Institute are presented. The activities of museums to collect, study, preserve and use museum collections in the educational and research process are characterized.

***Key words:** museum; office; laboratory; higher education institution; collection; museum subject.*

У 1920–1930-я гг. адбывалася фарміраванне новай сістэмы вышэйшай школы БССР, ствараліся ўстановы адукацыі новага тыпу, як цэнтры нацыянальнага значэння, уводзіліся новыя навучальныя праграмы, новыя курсы. Вышэйшыя навучальныя ўстановы ў сваёй дзейнасці не абмяжоўваліся выкананнем толькі навукова-даследчых функцый, яны займалі асаблівае месца і ў станаўленні беларускай культуры. Для ажыццяўлення навуковай, вучэбнай і асветніцкай дзейнасці ствараліся музеі рознага профілю, з мэтай забеспячэння навучальнага працэсу наглядным матэрыялам.

Пачынаючы з 1911 г. на тэрыторыі г. Віцебска дзейнічала **Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута (ВАМАІ)**, якое было адкрыта па ініцыятыве і на сродкі Віцебскай навуковай архіўнай камісіі. У 1919 г. камісія была ліквідавана, у выніку чаго Віцебскаму аддзяленню МАІ былі перададзены бібліятэка, музей з вялікай калекцыяй манет, гістарычны архіў і частка бібліятэкі езуіцкага калегіума. У 1921 г. пры этнаграфічным аддзяленні ВАМАІ быў заснаваны Этнаграфічны гурток, пазней рэарганізаваны ў Камісію, якая займалася зборам і вывучэннем матэрыяльнай спадчыны. Дзякуючы дзейнасці камісіі было запісана больш за 300 народных песень і сабрана каля 120 прадметаў матэрыяльнай культуры. На аснове сабраных матэрыялаў быў створаны *Этнаграфічны музей*, які ажыццяўляў падрыхтоўку музейных спецыялістаў. Навучанне доўжылася тры гады, а плата за навучанне складала 80 рублёў у год. Выпускнікі інстытута мелі права насіць на грудзях з правага боку спецыяльны знак спецыяліста [1].

Пасля закрыцця ў 1922 г. Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута, яго маёмасць павінна была быць перададзена Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту, размешчанага ў г. Мінску. Пры БДУ была створана камісія, якая займалася адборам гістарычных рарытэтаў для музея і бібліятэкі ўніверсітэта, у складзе прафесараў У. Н. Іванаўскага, М. М. Нікольскага, члена Праўлення універсітэта У. І. Корсака і загадчыка Дзяржаўнай і Універсітэцкай бібліятэкай І. Б. Сіманоўскі [5]. Аўтару дадзенага артыкула не ўдалося знайсці звестак аб факце перадачы дадзенай маёмасці або яго часткі БДУ.

У 1923 г. на базе Педагагічнага інстытута быў адкрыты **Вышэйшы педагагічны інстытут**, пры якім дзейнічаў *Музей этнаграфіі і археалогіі*. Аснову музея склалі калекцыі, перададзеныя з закрытага Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута. У музеі былі прадстаўлены ўзоры разьбы па дрэве, сабраныя з усёй тэрыторыі Беларусі. Пры інстытуце дзейнічала бібліятэка, якая налічвала каля 60 тыс. тамоў, сярод якіх былі каштоўныя выданні па краі, рэдкія старадрукаваныя кнігі, перададзеныя пасля закрыцця у 1820 г. Полацкай езуіцкай акадэміі [3, с. 4]. У 1924 г. быў выдадзены дэкрэт ЦВК РСФСР аб перадачы БССР 16 паветаў з пераважна беларускім насельніцтвам, па якім г. Віцебск увайшоў у склад БССР. Вышэйшы педагагічны інстытут быў зачынены, а яго выкладчыкі і студэнты былі пераведзены ў БДУ.

У 1924 г. пры падтрымцы Цэнтральнага ўпраўлення ветэрынарыі Наркомзема РСФСР была прынята пастанова Прэзідыума ЦВК БССР аб адкрыцці **Віцебскага ветэрынарнага інстытута (ВВІ)**. Аднымі з першых вучэбна-дапаможных устаноў інстытута сталі *Энтамалагічны і заалагічны музеі*, у аснову якіх была пакладзена калекцыя вядомага энтамолага У. А. Плюшчыка-Плюшчэўскага, першага загадчыка музеем. Сярод экспанатаў музея меліся каштоўныя і рэдкія муляжы па захворваннях, заалогіі, эвалюцыі чалавека, дарвінізме і інш. Размяшчаліся каштоўныя калекцыі жукоў і матылькоў Віцебшчыны – больш за 4000 экз., калекцыі жукоў еўрапейскіх і азіяцкіх відаў – больш за 14000 экз., сярод якіх меліся вельмі рэдкія асобнікі [4, с. 66].

Пачатак стварэнню *Анатамічнага му*зея пры ВВІ у 1925 г. паклаў прафесар кафедры анатоміі жывёл М. У. Прозараў. Частка экспанатаў была перададзена музею Віцебскім грамадствам натуралістаў. У 1926 г. у анатамічным тэатры была створана шкілетная майстэрня, для вырабу якой быў запрошаны навуковец препаратар А. М. Ляс. На яго былі ўскладзены абавязкі па нарыхтаванню навучальнага матэрыялу для студэнтаў, папаўненне шкілетамі і анатамічнымі прэпаратамі ўсіх музеяў інстытута. Усяго ў музеі ў 1927 г. значылася больш за 1600 экспанатаў: муляжы, мадэлі, прэпараты, чучалы, карціны, дыяграмы, плакаты і інш. [4, с. 59]. У вітрынах анатамічнага музея размяшчаліся прэпараты па розных раздзелах, напрыклад, "анатомія птушак", "апарат стрававання" і інш., а таксама найбольш каштоўныя прэпараты па раздзеле "органы руху" [6]. Анатамічны музей па колькасці экспанатаў і іх разнастайнасці быў адным з найбуйнейшых сярод музеяў ветэрынарных вышэйшых навучальных устаноў СССР.

У пачатку 1920-х гг. быў адкрыты *Арніталагічны музей*, які да 1926 г. налічваў 2820 экспанатаў па розных аддзелах: пудзілы птушак, чучалы млекакормячых, звярыныя галавы, звярыныя ногі, тушкі млекакормячых, тушкі птушак, птушыныя гнёзды і інш. Птушкі Віцебшчыны былі прадстаўлены ў музеі 132 відамі, птушкі іншых месцаў – 90, а ўсяго птушак – 222, сысуны Віцебшчыны – 28 відамі, іншых месцаў – 35, а ўсяго 63 выгляду. У музеі размяшчалася калекцыя змесціва страўнікаў птушак, якая складалася з больш за 600 экспанатаў, дзякуючы якой адбывалася вывучэнне пытанняў харчавання птушак Беларусі ў сувязі з порамі года і фізіялагічнымі зменамі ў самім арганізме птушак [4, с. 63].

У 1926 г. пры кафедры паталагічнай анатоміі прафесарам А. Д. Бальзаментам быў створаны *Паталагаанатамічны музей*, дзе была размешчана калекцыя гісталагічных прэпаратаў для правядзення практычнага курса паталагічнай анатоміі [11]. Музей з'яўляўся не толькі навучальнай установай, але і навукова-даследчай. У ім былі сабраны, вывучаны і экспанаваны матэрыялы, якія адлюстроўвалі агульныя патамарфалагічныя працэсы, а таксама паталагічныя змены пры розных хваробах жывёл.

У канцы 1920-х гг. з'явіўся шэраг музеяў пры розных кафедрах інстытута. Пры кафедры паразіталогіі і інвазійных хвароб жывёл быў адкрыты *Музей паразіталогіі*, які па колькасці і разнастайнасці экспанатаў ўяўляў сабой найбуйнейшы музей падобнага роду ў Беларусі. Заснавальнікам музея стаў І. А. Шчарбовіч. У музеі былі сабраныя ўнікальныя навуковыя калекцыі: паразітычныя чарвякі жывёл, птушак, амфібій, рыб і

інш. [10]. Экспанаты музея давалі магчымасць наглядна азнаёміцца з фарміраваннем і развіццём паразіталагічнай навукі ў рэгіёне.

У 1927 г. пачаў сваю дзейнасць музей кафедры ветэрынарна-санітарнай экспертызы. Першым музейным прэпаратам, створаным сіламі супрацоўнікаў музея, быў прэпарат па чуме свіней. З 1934 г. кафедру ўзначальваў вядомы вучоны, акадэмік Х. С Гарагляд, які паклаў пачатак стварэнню *Музея паталогіі мяса і мясапрадуктаў, рыбы, малочных вырабаў, тлушчу, прадуктаў раслiннага паходжання*, у якім былі прадстаўлены прэпараты, якія дэманстравалі змены ў органах, тканінах, цягліцах пераважна пры найбольш небяспечных інфекцыйных і інвазійных хваробах, а таксама змены пры хваробах незаразнай этыялогіі ў жывёл, рыб і птушак [9].

У 1928 г. пры кафедры заалогіі быў арганізаваны *Ветэрынарна-заалагічны музей*, загадчыкам якога быў прызначаны навуковец Шчэрбаў, а ў 1929 г. створаны *Біёлага-заалагічны музей* з майстэрнямі, яго загадчыкам стаў вучоны Маркаў [8]. У музеі былі прадстаўлены музейныя прэпараты па розных раздзелах: кольчатыя чарвякі, ракападобныя, павукападобныя, казуркі, малюскі, рыбы, земнаводныя, рэптыліі, птушкі, млекакормячыя і інш.

У 1934 г. паводле Пастановы Савета народных камісараў БССР быў адкрыты **Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (ВМІ)**. Адной з першых створаных кафедраў была класічная кафедра анатоміі. Кіраваў арганізацыяй кафедры па сумяшчальніцтве загадчык кафедры анатоміі Мінскага медыцынскага інстытута прафесар С. І. Лябёдкін, які надаваў вялікае значэнне ў навучальным і навуковым працэсе музейнай справе [7]. У 1922 г. прафесарам быў створаны Анатамічны музей пры інстытуце нармальнай анатоміі медыцынскага факультэта БДУ (з 1930 г. – Мінскі медыцынскі інстытут). Вялікі ўклад у 1937 г. у развіццё *Анатамічнага музея* кафедры анатоміі Віцебскага медыцынскага інстытута ўнёс прафесар У. І. Ашкадэраў [2, с. 159], які навучаў анатамічнай тэхніцы і музейнай справе сярэдні персанал і многіх студэнтаў, рукамі якіх быў створаны вялікі фонд сухіх і вільготных прэпаратаў па ўсіх раздзелах анатоміі, а таксама навучальны музей, які дапамагаў праз вывучэнне і дэталёвае знаёмства з метадамі вырабу анатамічных прэпаратаў зразумець асаблівасці будовы і функцыі арганізма ў працэсе філа- і антагенезу.

У 1935 г. пры кафедры патанатоміі ВМІ па ініцыятыве прафесара С. У. Вайнберга быў адкрыты *Музей паталагічнай анатоміі* [2, с. 160], які складаўся з паталагаанатамічных прэпаратаў, атрыманых пры аперацыях і розных прадметаў, сабраных для выкладання спецыяльных курсаў. У музеі былі прадстаўлены прэпараты, якія адлюстроўвалі паталогіі развіцця сардэчна-сасудзістай, нервовай, дыхальнай, эндакрыннай сістэм арганізма і інш. Навучальны музей з'яўляўся неабходным падраздзяленнем, дзе студэнтам дэманстраваліся тыпавыя праявы вывучаемых паталагічных працэсаў і назалогіі, а таксама шырока выкарыстоўваўся для самастойнай працы.

Такім чынам, у 1920-1930-е гг. навукоўцамі вышэйшых навучальных установаў г. Віцебска былі зроблены спробы стварэння і прымянення ў адукацыйным працэсе навучальных музеяў, мантаваных згодна з канкрэтным навучальным планам. Асаблівасцю дадзеных музеяў з'яўлялася іх вучэбна-адукацыйная і навукова-даследчая накіраванасць. Пад кіраўніцтвам прафесараў, буйных спецыялістаў у галіне профільных навук, у музеях універсітэта былі арганізаваны работы па збіранню, апрацоўцы, сістэматызацыі, захаванню і вывучэнню музейных калекцый. Музеі складаліся з музейных прадметаў, прэпаратаў і навучальных дапаможнікаў: малюнкаў, атласаў, дыяграм і т. д. Калекцыі забяспечвалі нагляднасць ў працэсе спасціжэння асноў натуральных і гуманітарных навук. Добра мантаваны музей дапамагаў рэалізаваць правядзенне Дальтан-плана, метаду навучання, пры якім студэнт атрымліваючы заданне, вывучаў той ці іншы аддзел самастойна па музейных прадметах. У выніку актыўнай перабудовы сістэмы вышэйшай адукацыі навучальныя музеі мелі вялікае значэнне ў станаўленні вышэйшай школы БССР і развіцця ў ёй вучэбнай і навуковай базы.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Хмяльніцкая Л. Гісторык з Віцебска (жыццяпіс Аляксея Сапунова). Мінск. 2001. URL: https://knihi.com/Ludmila_Chmialnickaja/Historyk_z_Viciebska_zycciapis_Alaksieja_Sapunova.html/ (дата обращения: 10.10.2019).
2. Медицинские и биологические музеи Витебска: история, современность, перспективы / С. М. Логвиненко, Н. В. Пивовар // Вестник Витебского государственного

медицинского университета. 2014. Т. 13, № 2. URL: http://vestnik.vsmu.by/downloads/2014/2/2014_13_2_157-164.pdf/ (дата обращения: 15.10.2019).
3. Малешка М. Віцебскі Вышэйшы Педагагічны Інстытут // Савецкая Беларусь. 1924. 24 лют.
4. Да гісторыі Беларуская Дзяржаўнага Вэтэрынарнага Інстытуту імя Кастрычнікавае рэвалюцыі (1924-1927 г.) / А. П. Алонаў. Віцебск, 1928.
5. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 10. С. 33.
6. Анатамічны музей // Афіцыйны сайт УА «Віцебская ордэна „Знак Пашаны” дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны» URL: https://www.vsavm.by/muzei/anatomicheskij-muzej/ (дата обращения: 12.10.2019).
7. Гісторыя кафедры анатоміі чалавека // Афіцыйны сайт УА «Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта». URL: https://www.vsmu.by/science/conference/68-departments/kafedra-anatomii-cheloveka/1604-istoriya-kafedry-anatomii-cheloveka.html/ (дата обращения: 12.10.2019).
8. Заалагічны музей // Афіцыйны сайт УА «Віцебская ордэна „Знак Пашаны” дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны» URL: https://www.vsavm.by/muzei/zoologicheskij-muzej/ (дата обращения: 11.10.2019).
9. Музей кафедры ветэрынарна-санітарнай экспертызы ім. Х.С. Гарэгляда // Афіцыйны сайт УА «Віцебская ордэна „Знак Пашаны” дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны» URL: https://www.vsavm.by/muzei/muzej-kafedry-veterinarno-sanitarnoj-ekspertizy-im-x-s-goreglyada/ (дата обращения: 15.10.2019).
10. Музей кафедры паразіталогії і інвазійных хвароб // Афіцыйны сайт УА «Віцебская ордэна „Знак Пашаны” дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны». URL: https://www.vsavm.by/muzei/muzej-kafedry-parazitologii-i-invazionnyx-boleznej/ (дата обращения: 12.10.2019).
11. Паталагаанатамічны музей // Афіцыйны сайт «Віцебская ордэна „Знак Пашаны” дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны». URL: https://www.vsavm.by/muzei/patologoanatomicheskij-muzej/ (дата обращения: 10.10.2019)

УДК: 94(476)

## ПРОБЛЕМЫ НАЦИОНАЛЬНОЙ ГОСУДАРСТВЕННОСТИ В ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКОМ ДВИЖЕНИИ В БЕЛАРУСИ (1917–1918 гг.)

***И.Ф. Романовский***

*Белорусский государственный университет, пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь, tatyanaroma@tut.by*

Рассматриваются программные установки политических партий и организаций по вопросам белорусской государственности. Определена их роль в формировании идеи неделимости и независимости Беларуси.

***Ключевые слова***: *национальное освободительное движение; либерально-демократическая ориентация; политическая партия; концепция независимой Беларуси; федерация; автономия; Всебелорусский съезд; равноправие; Белорусская Народная Республика.*

## ПРАБЛЕМЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ РУХУ НА БЕЛАРУСІ (1917–1918 гг.)

***І.Ф. Раманоўскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр.Незалежнасці, 4, 220030, г.Мінск, Беларусь, tatyanaroma@tut.by*

Аналізуюцца праграмныя ўстаноўкі палітычных партый і арганізацый па пытанням беларускай дзяржаўнасці. Вызначана іх роля ў фарміраванні ідэі непадзельнасці і незалежнасці Беларусі.

***Ключевые слова***: *нацыянальны вызваленчы рух; ліберальна-дэмакратычная арыентацыя; палітычная партыя; канцэпцыя незалежнай Беларусі; федэрацы; аўтаномія; Усебеларускі з’езд; раўнапраўе; Беларуская Народная Рэспубліка.*

## PROBLEMS OF NATIONAL STATEHOOD IN PUBLIC AND POLITICAL MOVEMENT IN BELARUS (1917–1918)

***I. Romanovskiy***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, tatyanaroma@tut.by*